Аляксандр Карацееў

# Не толькі маршы...



Каля Кургана Славы.

Дырыжор узмахнуў рукою, узляцелі бліскучыя трубы і... На плошчы запанавала цішыня, але толькі на імгненне. Загучала фанфара, і палілася мелодыя песні У. Алоўнікава «Радзіма мая дарагая». Святочныя калоны скрануліся з месца, пайшлі па плошчы пад велічныя гукі «Песні аб Радзіме» І. Дунаеўскага. Менавіта так штогод пачынае майскую дэманстрацыю працоўных Мінска духавы аркестр штаба Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

Гэты калектыў ваенных музыкантаў — вядучы духавы аркестр рэспублікі, які адыгрывае значную ролю ў музычным і культурным жыцці Беларусі, пераканаўча сцвярджае неабмежаваныя магчымасці жанру духавой музыкі, робіць важкі ўклад у яе развіццё, стымулюе творчасць кампазітараў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэат усесаюзных конкурсаў, духавы аркестр штаба ЧБВА з'яўляецца высокапрафесійным творчым калектывам з багатымі традыцыямі, індывідуальнай манерай выканання. Гэта дапамагае аркестру паспяхова выконваць службовыя абавязкі: іграць пры разводзе каравула, урачыстым прынясенні ваеннай прысягі, пры ўскладанні кветак дэлегацыямі саюзных рэспублік і кіраўнікамі дэлегацый замежных краін да помніка У. І. Леніну, манумента Перамогі, на Кургане Славы, пры страявой падрыхтоўцы ваенных парадаў. Акрамя гэтага аркестр на высокім узроўні абслугоўвае важныя грамадска-палітычныя, культурна-масавыя, спартыўныя мерапрыемствы. А ў час гастроляў у Мінску Вялікага тэатра СССР музыканты аркестра былі запрошаны для ўдзелу ў спектаклях.

Выступленні аркестра штаба ЧБВА ў час святкавання 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў шмат у чым садзейнічалі стварэнню атмасферы сапраўды ўсенароднага свята. Аркестр суправаджаў шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, удзельнічаў у тэатралізаваным прадстаўленні на стадыёне «Дынама», выступіў у канцэртнай праграме ў Палацы спорту.

Важнае месца ў творчай дзейнасці аркестра надаецца не толькі рабоце па музычна-эстэтычнаму, але і ваенна-патрыятычнаму выхаванню воінаў акругі, працоўных Беларусі. Аркестр актыўна ўдзельнічаў у рабоце пленума Усесаюзнай камісіі ваенна-патрыятычнай музыкі Саюза кампазітараў СССР, які адбыўся ў Мінску ў снежні 1981 года, у адкрыцці ў Мінску Усесаюзнай Вахты памяці. Музычнае суправаджэнне значных спартыўных спаборніцтваў дапамагае ўзняць настрой спартсменам, актывізуе балельшчыкаў. Аркестр штаба ЧБВА выступаў у час гульняў Алімпіяды-80 у Мінску, на спаборніцтвах на Кубак свету па біятлону, на X зімовай спартакіядзе дружалюбных армій.

Але акрамя ўсяго гэтага, у шматграннай дзейнасці аркестра важнае месца займае эстэтычнае выхаванне працоўных рэспублікі сродкамі музычнага мастацтва.

Гісторыя ваенных духавых аркестраў у нашай краіне пачынаецца з XVIII ст. Іх роля ў прапагандзе музычнага мастацтва вялікая. Як адзначаў У. Стасаў, «ваенныя аркестры — праваднікі не толькі адной ваеннай, але і ўсялякай музыкі ў масу народную»[1]. Гэтую слаўную традыцыю годна працягвае аркестр штаба ЧБВА, які на працягу сваёй гісторыі прапагандуе лепшыя ўзоры музычнага мастацтва.

А пачалося ўсё 1 красавіка 1950 года, калі камандуючы Беларускай ваеннай акругі маршал С. Цімашэнка аддаў загад аб фарміраванні пры штабе акругі штатнага аркестра. З першых гадоў дзейнасці калектыву, калі яго ўзначальвалі падпалкоўнік І. Міранові і капітан У. Мартынаў, пачалася актыўная творчая дзейнасць аркестра па прапагандзе музычнага мастацтва ў час канцэртаў і выступленняў перад працоўнымі рэспублікі. Аналіз рэпертуару першых гадоў паказвае, што ў гэты перыяд у асноўным выконваліся папулярныя маршавыя творы і танцавальная музыка.

Рэпертуар... Гэтае пытанне складанае для кожнага духавога аркестра. Рэпертуар не толькі вызначае творчае крэда калектыву, але і ўплывае на рост выканаўчага майстэрства музыкантаў. Духавы аркестр не павінен «падладжвацца» пад густы тых слухачоў, якія часам абмяжоўваюцца толькі танцавальнай музыкай і маршамі. Так, аркестр штаба ЧБВА ў цыкле праграм для дзяцей у канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі выканаў спецыяльна падрыхтаваную праграму з адных маршаў. У гэтым тэматычным канцэрце ў выкананні аркестра прагучалі маршы службова-страявога рэпертуару — сустрэчныя, паходныя, страявыя,— а таксама канцэртныя маршавыя творы і маршы з опер, кінафільмаў. Такая форма прапаганды ў спалучэнні з кваліфікаванымі каментарыямі музыказнаўца папулярызуе духавую музыку, асабліва сярод моладзі. Але ж гэта толькі пачатак! Духавым аркестрам неабходна настойліва прапагандаваць у сваіх канцэртных праграмах лепшыя ўзоры рускай, савецкай і замежнай класікі.

Знамянальна, што ў рэпертуары аркестра штаба ЧБВА з першых жа гадоў з'явіліся арыгінальныя творы для духавога аркестра М. Мяскоўскага, М. Іванова-Радкевіча, М. Іпалітава-Іванава, а таксама пералажэнні ўсіх сімфоній П. Чайкоўскага, V сімфоніі Л. Бетховена, II, VI, IX рапсодый Ф. Ліста, VII сімфоніі С. Пракоф'ева, V і VII сімфоній Д. Шастаковіча, шматлікія пералажэнні іншых кампазітараў-класікаў. Першыя канцэртныя праграмы пацвердзілі, што нястомны творчы пошук, заўсёды характэрны для аркестра штаба ЧБВА, дакладнае вызначэнне канкрэтных высокамастацкіх задач і ўвасабленне задум з'явіліся новай ступенню ў творчым росце калектыву.

Паспяховае спалучэнне службовых абавязкаў і канцэртнай дзейнасці спрыялі таму, што калектыў знаходзіўся ў выдатнай выканаўчай форме. Гэта пацвердзілі паспяховыя выступленні аркестра штаба ЧБВА на конкурсах духавых аркестраў Узброеных Сіл СССР, на якіх калектыў з Беларусі двойчы заваяваў званне лаўрэата (1960 і 1970 гг.). З праграм гэтых га-



Рэпетыцыя. Зводны духавы аркестр ЧБВА.



З духавым аркестрам штаба ЧБВА выступае народная артыстка СССР С. Данілюк.

доў адзначым такія творы, як уверцюра да оперы «Іван Сусанін» М. Глінкі, уверцюра з музыкі Л. Бетховена да трагедыі «Эгмант» В. Гётэ, «Варыяцыі і фуга на тэму Г. Пёрсела» Б. Брытэна, Сімфонія № 12 «1917 год» Д. Шастаковіча (I частка «Рэвалюцыйны Петраград»), інтрадукцыя да оперы «Апрычнік» П. Чайкоўскага, хор «Камачка» з оперы «Кастрычнік» В. Мурадэлі. На конкурсе 1970 года аркестр пазнаёміў слухачоў з творамі беларускіх кампазітараў — сюітай з балета «Мара» Я. Глебава, сімфанічнай паэмай «Партызанская быль» У. Алоўнікава, песнямі «Памяць сэрца» І. Лучанка і «Абеліскі» Д. Смольскага, якія выканаў саліст ДАВТ БССР А. Сухін.

Кожнаму канцэртнаму выступленню аркестра папярэднічае напружаная рэпетыцыйная работа. Менавіта тады вырашаюцца складаныя мастацкія задачы, якія ставіць галоўны дырыжор аркестра. Музыканты шмат займаюцца спецыяльнай падрыхтоўкай, удасканальваюць свой выканаўчы ўзровень. З майстэрства кожнага з іх складаецца майстэрства ўсяго аркестра. У падрыхтоўцы музыкантаў кіраўніцтва аркестра надае вялікую ўвагу заняткам розных груп калектыву.

На прыкладзе работы ансамбляў духавых інструментаў відаць, якое шырокае кола пытанняў і мастацкіх задач вырашаюць музыканты. Выканаўчы ўзровень вызначаецца калектыўнай творчасцю, скіраванай на дасягненне адзінства мыслення і раскрыцця мастацкай задумы кампазітара ў тым або іншым творы. Гэта ажыццяўляецца шляхам выпрацоўкі адзінай інтанацыі, добрага адчування балансу ў дынаміцы гучання, тэмбравай злітнасці. Кожны ўдзельнік ансамбля павінен суадносіць уласныя магчымасці, асаблівасці выканаўчага стылю, тэхнічнае майстэрства з творчым патэнцыялам іншых удзельнікаў ансамбля. Трэба сказаць, што вядучыя музыканты аркестра штаба ЧБВА ўпэўнена спраўляюцца з гэтымі патрабаваннямі ансамблевага выканання.

Сольныя выступленні музыкантаў аркестра з суправаджэннем, выступленні ансамбляў духавых інструментаў, аркестра поўным складам на традыцыйных аглядах-конкурсах і заключных канцэртах штатных духавых аркестраў акругі заўсёды робяцца прыкметнай падзеяй у музычным жыцці рэспублікі. Але, як правіла, гэтыя агляды-конкурсы збіраюць перш за ўсё падрыхтаваную аўдыторыю — ваенных музыкантаў, артыстаў прафесійных аркестраў, выкладчыкаў, студэнтаў і навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, музычных школ, кіраўнікоў і ўдзельнікаў самадзейных духавых



Духавы аркестр штаба ЧБВА пад кіраўніцтвам Б. Чудакова.

аркестраў. Такія канцэрты трэба шырока рэкламаваць (шматлікія аматары духавой музыкі, як правіла, не ведаюць пра іх), тым больш што ў час аглядаў-конкурсаў запланаваны марш-парады лепшых ваенных духавых аркестраў акругі.

Выступленні калектыву аркестра штаба ЧБВА ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі прыцягваюць усё больш і больш слухачоў. І гэта заканамерна, таму што кожны канцэрт сведчыць пра творчае развіццё музыкантаў і дае магчымасць слухачам сустрэцца з цікавымі творамі, якія раней не гучалі (выключэннем з'яўляецца выкананне амаль на кожным канцэрце старадаўняга рускага баявога марша «Развітанне славянкі» В. Агапкіна).

Адзін з такіх канцэртаў аркестр пачаў маршам «Перамога за намі». Ён напісаны заснавальнікам савецкай ваеннай музыкі лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаным дзеячам мастацтваў РСФСР, прафесарам генерал-маёрам С. Чарнецкім, які ў свой час быў галоўным інспектарам ваенных аркестраў краіны. Неабходна адзначыць удалую інтэрпрэтацыю твора мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам аркестра заслужаным артыстам БССР Барысам Чудаковым. Дырыжор здолеў пераканаўча перадаць слухачам не толькі характар твора, але і раскрыў праз яго адметныя рысы творчасці аднаго з заснавальнікаў савецкай маршавай літаратуры — выключную дакладнасць і імпульсіўнасць рытму, багатую меладычнасць, кампактную і яскравую інструментоўку. Аркестр пад кіраўніцтвам Б. Чудакова прадэманстраваў рытмічную зладжанасць і вытанчаную кантрастнасць, на дзіва тонкую градацыю ад пяшчотнага, хвалюючага піянісіма да ўрачыстага і магутнага фарцісіма.

Музыка, як вядома, не толькі мае значны эмацыянальны патэнцыял, фарміруе эстэтычныя густы, узбагачае духоўны свет чалавека, але і выхоўвае яго. Вялікае месца ў канцэртных праграмах аркестра займаюць творы ваенна-патрыятычнай тэматыкі. Невыпадкова на канцэртах слухачы добра прымаюць фантазію на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны Б. Дзіева, «Вальс» з оперы «Світанкі тут ціхія» К. Малчанава, у якім аркестр па-майстэрску раскрывае багатую штрыхавую палітру, захапляе слухачоў прыгожай меладычнай лініяй і драматычнай кульмінацыяй. Гімнам Радзіме, данінай гераізму і мужнасці нашага народа з'яўляецца выкананне ў канцэртных праграмах Урачыстай уверцюры «1812 год» П. Чайкоўскага.

Аркестр штаба ЧБВА плённа працуе з вядомымі выканаўцамі. Гэты калектыў дапамагае сольным выступленням музыкантаў, максімальна садзейнічае раскрыццю кожнага твора. З аркестрам ваенных музыкантаў паспяхова выступалі многія салісты-вакалісты: народная артыстка СССР С. Данілюк, заслужаная артыстка БССР Л. Златава, В. Цішына, народныя артысты БССР І. Сарокін і В. Чарнабаеў, заслужаныя артысты БССР А. Сухін і А. Падгайскі, салісты-інструменталісты Л. Дворжац (фартэпіяна), А. Фісейскі (арган), Ю. Лапароў (труба) і іншыя.

Упрыгожылі канцэртныя праграмы аркестра штаба ЧБВА выступленні саліста Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР заслужанага артыста рэспублікі В. Волкава (труба). Аркестр і саліст выканалі прэм'еру п'есы для трубы-пікала «Здравіца» А. Мдывані. Гэтая п'еса чаруе эмацыянальнасцю, багатым меладызмам, шырынёй і выразнасцю сольнай партыі, у якой В. Волкаў не толькі прадэманстраваў віртуознае валоданне складаным інструментам і лёгкасць гучання ў верхнім рэгістры, але і паказаў сябе цікавым інтэрпрэтатарам. Трэба адзначыць і бліскучае выкананне В. Волкавым папулярнага твора «Свята трубы» Б. Пейджа, у якім ён аднолькава лёгка ва ўсіх рэгістрах валодае інструментам, скарае слухачоў выдатнай тэхнікай, прыгожым, высакародным і сакавітым тэмбрам.

У апошні час аркестр штаба ЧБВА ўсё часцей звяртаецца да выканання твораў эстраднага рэпертуару. Гэта сведчыць пра сапраўды творчы падыход да развіцця духавых аркестраў і пашырэння іх рэпертуару. Вялікую цікавасць у слухачоў выклікае сучасная эстрадная п'еса «Крэшчэнда» кампазітара К. П. Брухмана. Гэты твор нагадвае вядомую джазавую п'есу «Караван» Х. Тызола і Д. Элінгтона. У п'есе адбылося эфектнае спалучэнне тэмбраў і дынамікі пры выкананні сольных партый габоем, трубой з сурдзінай і трамбонам, а таксама ў туці. Пашырэнне творчага дыяпазону духавога аркестра калектыў ваенных музыкантаў прадэманстраваў у п'есе «Асенні дождж» Р. Паулса (саліст У. Навуменка). Да традыцыйнага гучання аркестра далучыліся бас-гітара і ўдарная ўстаноўка. Духавы аркестр загучаў як эстрадны калектыў, або біг-бэнд. Яскрава гучала група трамбонаў, звонка — труб, мякка — група саксафонаў.

Работа аркестра штаба ЧБВА ў эстрадным напрамку яшчэ раз пераконвае ў багатых магчымасцях духавога аркестра, які можа вырашаць складаныя пытанні прапаганды розных жанраў музычнага мастацтва. Інтэнсіўная дзейнасць гэтага калектыву натхняе і самадзейныя духавыя аркестры.

35-годдзе творчай дзейнасці духавога аркестра штаба ЧБВА амаль супадае з святкаваннем 40-годдзя Вялікай Перамогі. Калектыў аркестра ўдзельнічаў ва ўсіх урачыстасцях. Тысячы людзей пабачылі выступленні аркестра, пачулі славутыя ваенныя маршы, лірычныя творы ваенных гадоў, п'есы кампазітараў-класікаў і сучасных аўтараў. Час ставіць перад калектывам новыя творчыя пытанні. І духавы аркестр штаба ЧБВА адказвае на іх новымі творамі, праграмамі, выступленнямі перад удзячнымі слухачамі...

Вось-вось дырыжор узмахне рукой, узляцяць бліскучыя трубы і...

Дзень добры, свята!

Фота з архіва аркестра штаба ЧБВА.

---

[1] Стасов В. В. Избранные произведения в 3-х томах.— М.: Искусство, 1952. Т. 1, с. 177.



*Вячаслаў Лапцік*

# ПРАЦЯГВАЕМ КНІГУ ЧАСУ

**Развагі пасля рэспубліканскага фестывалю сучаснай літоўскай драматургіі ў Шаўляі**

Ад удараў цяжкія мячы сыпалі іскры — нібы распалены метал на кавадле. Адзіным енкам стагналі зямля і людзі. Не на жыццё, а на смерць сekліся з ворагам літоўцы, і падалі, як пераспелы боб на зямлю, галовы крыжакоў. Бачыў князь Вікінтас, што перамог пад Сауле. Але чорныя думкі апанавалі яго: узняць меч і на братнюю Літву, дзе ўладарыць вялікі Міндоўг, і далучыць да сваёй Жмудзі вялікія землі ўсходнія. Узняць меч на сваіх братоў? Чыя кроў кіпіць у яго жылах? Здрада і несправядлівасць заўсёды караюцца бязлітасна: перамог Міндоўг здрадніка і смерць загадаў прыняць яму не рыцарскую.

На гэты спектакль Клайпедскага драматычнага тэатра не проста было трапіць: ад прыпынку аўтобуса і да дзвярэй стаяў вялікі натоўп і ўсе пыталі лішняга білеціка.

Нацыянальны тэатр у Літве карыстаецца вялікай папулярнасцю. Што хвалюе драматургію братняй рэспублікі, якая тэма сугучная настрою сённяшніх гледачоў?

Я нездарма пачаў свой артыкул са спектакля «Сонца і яго зямля» Ю. Марцінкявічуса. Тэматыка твора — гістарычная, і менавіта яна прыцягвае да сябе пільную ўвагу аматараў тэатра Літвы. Лёс нацыі, яе гістарычнае мінулае, развіццё, узлёты і цяжкія часіны — пра гэта трэба ведаць усім.

Прарочымі падаюцца ў спектаклі клайпедскага тэатра словы Стваральніка (заслужаны артыст Літоўскай ССР Б. Гражыс): «Я падзяліў гэтую прыгожую зямлю пароўну, а месца для шчасця хопіць усім. Загубіць народы можа толькі зло і нясцерпная прага авалодаць лёсам іншых». «Няхай будзе пракляты той, хто здрадзіць сабе, двойчы — сваайму брату, тройчы — ра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ